3. ГАБО. – Ф. 5. Оп. 1. Д. 6560.
4. ГАБО. – Ф. 2177. Оп. 2. Д. 46.
5. Юлиан Урсын Немцевич: жизнь и творчество : библиогр. материалы / сост. Т. С. Ковенько, И. А. Павлючук, Х. Байковска. – Брест : Брест. тип., 2007. – 56 с.
6. Niemcewicz, S. U. Moimwnukom : [история рода Немцевичей с конца XV века по 1979 года] / S. U. Niemcewicz // Miscellanea oraz Wspomnienia własne dotyczące Niemcewiczów. – 2002. – Cz. V.

УДК 94(476):323.17 «1917»
**А.А. РАЙЧОНАК**
Беларусь, Мінск, БДТУ

## ПРАБЛЕМА НАЦЫЯНАЛЬНАГА САМАВЫЗНАЧЭННЯ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРЫЯД ПАМІЖ РЭВАЛЮЦЫЯМІ 1917 г.

У 2017 г. спаўняецца сто гадоў лёсавызначальным падзеям, якія змянілі гістарычны шлях не толькі Беларусі, але і ўсяго свету. Сёння мы можам непрадузята зірнуць на падзеі рэвалюцый 1917 г., вызначыўшы іх месца і ролю ў айчыннай гісторыі.

Адразу ж пасля звяржэння царызму пачалася актыўная праца па стварэнню органаў, якія спрабавалі вырашыць пытанне аб уладзе ў Беларусі. Гэтая праца, на наш погляд, вялася адразу па чатырох накірунках, што было выклікана розным разуменнем будучага рэвалюцыйнай Расіі ўвогуле і Беларусі ў прыватнасці. Асноўная дзейнасць у гэтым накірунку была разгорнута: 1) Саветамі рабочых, салдатскіх і сялянскіх дэпутатаў; 2) органамі, утворанымі Часовым урадам; 3) органамі вайсковага камандавання Заходняга фронту; 4) узнікшым некалькі пазней Беларускім нацыянальным камітэтам.

Працэс стварэння Саветаў пачаўся 4 сакавіка, калі стварыўся Мінскі Савет рабочых дэпутатаў і быў абраны Часовы выканаўчы камітэт, у якім да Кастрычніцкай рэвалюцыі бальшавікі займалі дамінуючае становішча, што адыграла немалаважную ролю ў далейшым развіцці падзей. 6 сакавіка было прынята рашэнне аб аб'яднанні рабочых і салдацкіх дэпутатаў у адзіны Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. На гэтым скончыўся працэс фарміравання Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў у Мінску. У той жа час быў створаны такі ж орган у Гомелі, але там самай шматлікай групай з'яўляліся меншавікі. 4–8 сакавіка паўстае Віцебскі савет. Фарміруюцца саветы ў Полацку, Оршы, Бабруйску. Што ж тычыцца Магілёва, то там стварэнне саветаў было замаруджана знаходжаннем Стаўкі Галоўнакамандавання.

Адносна агульнапалітычных задач заўважым, што на сваім пасяджэнні 8 сакавіка Мінскі савет вызначыў іх наступным чынам: «Вітаючы Часовы ўрад, Мінскі савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў падкрэсліў, што падтрымку Часоваму ўраду ён акажа толькі ў тым выпадку, калі ён будзе весці няўхільную барацьбу з прыхільнікамі скінутага царскага ўрада, калі будзе абараняць палітычныя правы і свабоды ўсяго насельніцтва, будзе падрыхтоўваць скліканне Устаноўчага сходу і ўсталяванне дэмакратычнай рэспублікі» [4, арк. 21].

У пачатку сакавіка ў Беларусі пачалі ствараццa і органы Часовага ўрада. Ужо вечарам 3 сакавіка ў Мінску ў спешным парадку была склікана нарада, на якой прысутнічалі галосныя гарадской думы, прадстаўнікі Земскага і гарадскога саюзаў, губернскага і павятовага земстваў, прадстаўнікі духавенства, мясцовых нацыянальных грамадстваў (рускага, яўрэйскага, польскага) – увогуле 70 чалавек, у тым ліку 2 прадстаўніка ад рабочых. У ходзе гэтай нарады грамадзянскім камендантам Мінска быў прызначаны Б.М. Самойленка – старшыня Мінскай губернскай земскай управы і Вайскова-прамысловага камітэта.

6 сакавіка Часовы ўрад прызнаў неабходным адхіліць ад улады губернатара і віцэ-губернатара, а іх абавязкі па кіраўніцтву губерняй ускласці на Б. Самойленку. 7 сакавіка быў утвораны Гарадскі камітэт грамадскай бяспекі, у які ўваходзіла па аднаму дэлегату ад беларускай, рускай, польскай і яўрэйскай нацыянальнасцяў, 3 дэлегаты ад Савета рабочых дэпутаў і 6 ад гарадской управы. Адно месца было пакінута для вайскоўцаў. Практычна ва ўсіх беларускіх губернях фармаванне органаў новай улады адбывалася адначасова. У гэты ж час ствараліся органы Часовага ўрада ў Віцебску, Магілёве, Гомелі, Оршы, Бабруйску, Полацку, Рагачове і іншых гарадах і павятовых цэнтрах.

Такім чынам, можна канстатаваць, што з атрыманнем звестак аб Лютаўскай рэвалюцыі ў пачатку сакавіка рэвалюцыйны рух у асноўным ахапіў губернскія і павятовыя цэнтры. У вёсцы ж пераўтварэнні пачаліся некалькі пазней, пераважна ў красавіку – пачатку мая.

У разглядаемых намі падзеях нельга пакінуць без увагі пазіцыю вайсковага камандавання. У сувязі з тым, што Беларусь (неакупаваная яе частка) знаходзілася фактычна ў прыфрантавой паласе, усе дзяржаўныя ўстановы і грамадскія арганізацыі былі вымушаны лічыцца з меркаваннем вайсковых уладаў, якія складаліся пераважна з кансерватыўна настроенага генералітэта. Фармальна не ўмешваючыся ў дзеянні грамадзянскіх улад, вайсковае камандаванне мела дастаткова сіл, каб прымусіць лічыцца з яго пазіцыяй грамадзянскія органы.

Пацверджаннем гэтаму можа служыць загад № 1 Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага, які прапанаваў органам Часовага ўрада, а таксама штабу Заходняга фронта стаць на шлях кампрамісу з Саветамі рабочых дэпутатаў, калі яны складаліся з памяркоўных элементаў і стаялі на пазіцыі неабходнасці працягу вайны да перамогі. Гэта ж тэлефанаграма патрабавала ад камандзіраў вайсковых часцей устанавіць кантроль за выбарамі салдацкіх дэпутатаў з мэтай правядзення ў іх склад асоб, падтрымліваючых лінію ўрада [3, с. 137].

Калі ў Беларусі ўзмацнілася сацыяльная напружанасць у вёсцы восенню 1917 г., мясцовая ўлада звярнулася за дапамогай менавіта да вайсковага камандавання ў асобе генерала Балуева (галоўнакамандуючага Заходнім фронтам), які 8 кастрычніка запатрабаваў спыніць аграрныя хваляванні. Тым, хто не падпарадкуецца, ён пагражаў прымяненнем мер згодна віны і ваеннага становішча, існуючым на тэтыторыі, якая прылягае непасрэдна да Заходняга фронта [6, арк. 14].

Характарызуючы беларускі рух пасля Лютаўскай рэвалюцыі, будзе да месца прывесці меркаванне М. Доўнар-Запольскага: «Што датычыць усходняй

Беларусі, то Лютаўская рэвалюцыя застала беларускі рэвалюцыйны кірунак у момант няяснасці яго праграмы і канчатковых мэт. Нацыянальная ідэя, ідэя нацыянальнага адраджэння, аб'ядноўвала колы беларускіх работнікаў Петраграда, Мінска, Масквы і Вільні, але прыватнасці палітычнай ідэалогіі былі не ясныя, або хутчэй розныя элементы беларускіх рэвалюцыйных колаў не дамовіліся адносна вострых пытанняў будучыні» [2, с. 469].

Гэтыя рознагалоссі ў многім ускладнілі развіццё нацыянальнага руху, што доўгі час сказвалася на практычнай працы нацыянальных арганізацый. Фактычна на працягу ўсяго 1917 г. ім прыходзілася звяртацца да ўнутрыарганізацыйнай палемікі аб шляхах далейшага развіцця Беларусі. Гэта аб'ектыўна аслабляла нацыянальна-дзяржаўны рух. Тым не менш пасля лютага беларускі рух пачынае набываць шырокі, арганізаваны характар. Першымі такую працу распачалі беларускія колы Петраграда і Мінска.

У пачатку сакавіка 1917 г. у Беларускім бежанскім камітэце адбыўся сход прадстаўнікоў беларускіх арганізацый Петраграда. Сярод іх успыхнулі вострыя спрэчкі аб далейшым накірунку працы. Як высветліла дыскусія, большасць удзельнікаў сходу стаяла на платформе БСГ.

15 сакавіка прымаецца Дэкларацыя Беларускай народнай арганізацыі ў Петраградзе, якая ў хуткім часе была надрукавана ў «Известиях Петроградского Совета рабочих и солдатских депутатов». У ёй, у прыватнасці, гаварылася: «Мы верым, што Устаноўчы сход правільна вырашыць пытанне і пераўтворыць Расію на пачатках Федэратыўнай Рэспублікі» [5, арк. 1]. Выстаўляліся патрабаванні: уведзенне выкладання ў школах на нацыянальнай мове, удзел мясцовага насельніцтва ў самакіраванні, адміністрацыя, прызначаемая цэнтральным кіраўніцтвам, павінна быць знаёма з краем, бытам і мовай народа, які пражывае ў дадзенай мясцовасці.

З першых дзён рэвалюцыі ў Мінску ўтвараецца беларускі нацыянальны камітэт, які распачынае энергічную арганізацыйную і прапагандысцкую працу. Так, 25 сакавіка ў Мінску адбыўся з'езд беларускіх нацыянальных арганізацый, на якім прысутнічала каля 150 дэлегатаў [9, с. 78]. Асноўнай мэтай з'езда з'яўлялася выпрацоўка задач беларускага руху ў новых умовах. Для кіравання краем у кантакце з Часовым урадам быў абраны Беларускі нацыянальны камітэт, у які ўвайшлі 18 чалавек: Р.А. Скірмунт (старшыня), П.П. Аляксюк, У.С. Фальскі, Б.А. Тарашкевіч, Л.І. Заяц, А.Н. Смоліч, Э.А. Будзька, В.І. Гадлеўскі, Я.С. Канчар, І.І. Краскоўскі, А.Л. Бурбіс, К.К. Кастравіцкі, Бабарыкін, Ф.Г. Шантыр, М.С. Кахановіч, В.Л. Ластоўскі, Л.І. Дубейкоўскі, Д.Х. Жылуновіч. Дзесяць з іх прыналежалі да Беларускай сацыялістычнай грамады. Аднак яго курс вызначала ў першую чаргу кіраўніцтва (Р.А. Скірмунт, П.П. Алексюк, В.І. Гадлеўскі), чые погляды не выходзілі за рамкі праграмы кадэтаў.

Агульнай тэндэнцыяй усіх палітычных рухаў у дадзены час было імкненне падпарадкаваць сабе сялянскі рух. Як ужо адзначалася вышэй, рэвалюцыйныя пераўтварэнні ў вёсцы пачаліся пазней, у красакавіку – пачатку мая 1917 г. Гэта было звязана з тым, што ў беларускую глыбінку звесткі аб звяржэнні самаўладдзя траплялі са значным спазненнем. Сведчаннем гэтаму, а таксама

паказчыкам агульнасялянскіх настрояў служыць справаздача эмісараў Часовага ўраду, пабываўшых у пачатку красавіка ў Палескай воласці. Яны адзначалі: «Ва ўсіх вёсках воласці сяляне даведаліся аб перавароце напрыканцы сакавіка. Безумоўна, вельмі задаволены тым, што здарылася і да новага парадку ставяцца спачувальна. Заўважана, што да нашага наведвання апасаліся, каб не вярнулася старая ўлада і не паўтарыўся 1905 год» [7].

У красавіку сялянскія з'езды на Беларусі праводзяць бальшавікі, эсэры і БНК. Што тычыцца пастаноў, то яны ў прынцыпе адлюстроўвалі праграмныя палажэнні склікаўшых іх арганізацый. З'езд сялян Мінскай і Віленскай губерняў, падрыхтаваны бальшавікамі і эсэрамі, выказаўся супраць аўтаноміі Беларусі, а з'езд БНК падтрымаў гэтую ідэю, але ён быў малапрадстаўнічы.

Акрамя таго, беларускія дзеячы зрабілі сур'ёзную памылку, паставіўшы на чале БНК буйнага памешчыка Р. Скірмунта, фігуру, непапулярную сярод сялянства. Гэтую памылку ўмела выкарысталі праціўнікі беларускага руху, прадставіўшы сялянам беларускае пытанне як «польскую інтрыгу», а ў доказ гэтаму тэзісу прыводзілі асобу Скірмунта, вядомага сваімі цеснымі сувязямі з польскімі і літоўскімі коламі.

Такім чынам, сялянства не пайшло за БНК, а беларускім дзеячам прышлося затраціць шмат сіл, каб даказаць шырокім масам, што беларускі рух не з'яўляецца «польскай інтрыгай», а сапраўды адлюстроўвае інтарэсы карэннай нацыі беларускага краю.

Другім накірункам дзейнасці БНК была спроба ўвайсці ў кантакт з Часовым урадам і дамагчыся ад яго перадачы мясцовай улады ў краі ў рукі БНК. Нягледзячы на тое, што дэлегацыя, накіраваная ў сярэдзіне красавіка для гэтых мэтаў, была прынята Часовым урадам, які згадзіўся наладзіць пастаянны кантакт з БНК, канкрэтныя прапановы з боку дэлегацыі былі сустрэты холадна. Было заяўлена, што гэтае пытанне знаходзіцца ў кампетэнцыі будучага Ўстаноўчага сходу, і Часовы ўрад не мае паўнамоцтваў на яго вырашэнне. Усё гэта прывяло беларускіх дзеячоў да ўсведамлення таго, «што праўдзівую волю Беларусь здабудзе толькі тады, калі за палітычнымі лозунгамі будзе стаяць маса – арганізаваны народ» [1, с. 11]. У працэсе барацьбы за ўладу гэты перыяд характарызуецца рэзкім абвастрэннем адносін паміж органамі Часовага ўрада і Саветамі, што па сутнасці адлюстроўвае агульнарасійскі працэс заканчэння двоеўладдзя пасля ліпеньскіх падзей у Петраградзе.

На Беларусі, у прыватнасці ў Мінску, гэты працэс пачаўся яшчэ раней. Так, у тэлеграме губкамісара Дземідецкага на імя Міністра ўнутраных спраў ад 18 чэрвеня 1917 г. гаварылася, што ў адрозненне ад іншых Саветаў, дзе большасць належала эсэрам і меншавікам, у Мінску гэты Савет складаецца пераважна з бальшавікоў. Кантакт з імі вельмі цяжкі, паколькі яны ігнаруюць мясцовыя органы ўлады, а пастановы іх не прымальныя. Ён прасіў дазвол на правядзенне новых выбараў у Саветы, якія ў цяперашніх умовах, на яго думку, павінны быць станоўчымі для ўраду. Не змянілася гэта становішча і праз месяц. У дакладной запісцы сябра Міністра ўнутраных спраў Р. Лявонцьева, датаванай 22 ліпенем 1917 г., гаворыцца

аб тым, што Мінскі Савет займае крайне варожае становішча да Часовага ўрада і па сутнасці з'яўляецца партыйным органам бальшавікоў [8, арк. 10].

Беларускі рух у пачатку Лютаўскай рэвалюцыі не меў дастатковых сіл, каб уключыцца ў барацьбу за ўладу, паступова набываў гэтыя сілы. Паказчыкам гэтага працэсу можа быць колькасны рост найбольш уплывовай беларускай партыі БСГ. З сярэдзіны лета да кастрычніка 1917 г. колькасны склад партыі ўзрос з 5 тыс. чалавек да 10 тыс., гэта значыць, што за 3 з невялікім месяцы партыя ўзрасла ў 2 разы. Для таго каб уявіць ступень яе ўплыву, будзе да месца нагадаць, што напярэдадні Лютаўскай рэвалюцыі беларускі нацыянальны рух выяўляўся ў дзеянні нешматлікіх, разрозненых груп. Восенню 1917 г. пачынаецца паласа беларускіх вайсковых з'ездаў, якія з'явіліся новым моцным струмянём беларускага руху.

Падводзячы вынікі стану развіцця ідэі беларускай дзяржаўнасці напярэдадні спроб яе практычнай рэалізацыі, можна зазначыць наступнае. Па-першае, беларуская нацыя ў гэты час уступіла ў заключную фазу свайго фарміравання і была гатова весці барацьбу за права на самавызначэнне, але асаблівасці яе гістарычнага лёсу прывялі да пэўнай дэфармацыі яе сацыяльнай і эканамічнай структуры. Сярод галоўных праблем, якія запавольвалі працэсу дзяржаватворчасці, былі: слабая класавая дыферэнцыяцыя, нізкі ўзровень урбанізацыі, развіццё капіталістычнай вытворчасці пераважна ў сельскай гаспадарцы пры наяўнасці значных перажыткаў феадалізму і вялікай аграрнай перанаселянасці, адсутнасць сістэмы нацыянальнай адукацыі і буйных універсітэцкіх цэнтраў. Па-другое, беларускі нацыянальны рух выпрацаваў свае асноўныя ідэалагічныя палажэнні, сярод якіх адно з галоўных патрабаванне права на самавызначэнне беларускай нацыі і патрабаванне аўтаноміі ў якасці канкрэтнай формы ўвасаблення гэтага права. Гэтыя патрабаванні былі характэрныя і для іншых еўрапейскіх нацыянальна-вызваленчых рухаў дадзенага часу, што дазваляе разглядаць беларускі нацыянальны рух як частку еўрапейскага. Па-трэцяе, Першая сусветная вайна і Лютаўская рэвалюцыя выступілі ў якасці каталізатара беларускага нацыянальнага руху і значна прасунулі наперад яго палітычныя патрабаванні. У гэты час фактычна фарміруюцца ўсе галоўныя ідэалагічныя плыні беларускага нацынальнага руху і выпрацоўваюцца асноўныя падыходы да праблемы ўвасаблення беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Гэта, у сваю чаргу, ставіць на парадак дня неабходнасць канкрэтнага ажыццяўлення ідэі беларускай дзяржаўнасці.

Кастрычніцкая рэвалюцыя дала новы паварот развіццю працэсу станаўлення беларускай дзяржаўнасці. Абвешчаны бальшавікамі лозунг свабоднага самавызначэння народаў аж да аддзялення паставіў беларускія арганізацыі і партыі непасрэдна перад пытаннем нацыянальнага і дзяржаўнага самавызначэння Беларусі. Практычна адразу пасля прыходу да ўлады бальшавікі заявілі аб прадастаўленні незалежнасці Польшчы і Фінляндыі. Тым не менш, асноўная маса беларускіх дзеячаў працягвала заставацца на пазіцыях аўтанамізму.

1. Доўнар-Запольскі, М. В. Гісторыя Беларусі / М. В. Доўнар-Запольскі. – Мінск : БелЭн, 1994. – 510 с.

2. Игнатенко, И. М. Февральская буржуазно-демократическая революция в Белоруссии / И. М. Игнатенко. – Минск : Наука и техника, 1986. – 344 с.

3. Навіна, Ант. (Луцкевіч). Палітычные лозунгі беларускага руху / Ант. Навіна // Наша Ніва. – Вільня, 1920.
4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Ф. 4-п. Воп. 2. Спр. 52.
5. НАРБ. – Ф. 60. Воп. 3. Спр. 175.
6. НАРБ. – Ф. 60. Воп. 3. Спр. 194.
7. НАРБ. – Ф. 60. Воп. 3. Спр. 143.
8. НАРБ. – Ф. 60. Воп. 3. Спр. 151.
9. Рудовіч, С. Час выбару: Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе / С. Рудовіч ; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск : Тэхналогія, 2001. – 200 с.

УДК 94(477)
**Е.Ю. БОРИСЕНОК**
Россия, Институт славяноведения РАН

## ПРОБЛЕМА НАЦИОНАЛЬНОЙ КУЛЬТУРЫ В КОРЕНИЗАЦИИ 1920-х гг. (НА ПРИМЕРЕ УССР)

Советская политика по регулированию этнокультурных процессов в национальных республиках представляет собой весьма интересный опыт, заслуживающий детального рассмотрения. Подвергнув резкой критике ассимиляцию – «наследие царского режима» – большевики создали систему национальных территориальных образований, от республик до таких мелких единиц, как национальные советы, установив таким образом связь между этничностью и территорией. На каждой национальной территории язык и культура титульной нации должны были занимать преобладающее положение, чего, впрочем, не всегда удавалось достичь: исторический опыт главенства русского языка и культуры и коммуникативные потребности единого государства мешали претворить в жизнь самые радикальные проекты, выдвигаемые национально настроенными группами коммунистов.

Особый интерес представляет Украинская ССР: именно эта республика стала одним из образцов претворения в жизнь советской национальной и культурной политики. Политика коренизации (или украинизации, если говорить о ее региональной форме), инициированная большевиками на XII съезде партии в 1923 г., достигла здесь значительного размаха. Именно на территории УССР украинизация приобрела законченный и ярко выраженный характер, продемонстрировав всю палитру узловых проблем, с которыми пришлось столкнуться советскому руководству при проведении в жизнь задуманных планов. Ярким примером являлась проблема соотношения украинской и русской культуры на пространстве национальной республики.

Украинская ССР представляла собой регион со сложным этническим рельефом. К началу XX в. к крестьянскому сословию относилось 93 % всех украинцев в Российской империи, а среди городского населения украинцы составляли всего 30 % [4, с. 25, 40]. В городах проживало в основном русское